**Білет 15**

**Практычнае заданне.**
**БССР у гады новай эканамічнай палітыкі**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. У якім годзе была ўведзена новая эканамічная палітыка?
2. Складзіце схему (або "лагічны ланцужок"): "Прычыны ўвядзення новай эканамічнай палітыкі".
3. Чым натуральны падатак, які быў уведзены ў 1921 годзе, адрозніваўся ад харчразвёрсткі?
4. Растлумачце, чаму ва ўмовах мірнага часу "новая эканамічная палітыка" аказалася больш эфектыўнай, чым палітыка "ваеннага камунізму"?

**I. Сацыяльнаэканамічнае становішча Беларусі.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас»)*

Вынікі Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў, акупацыя Беларусі германскімі і польскімі войскамі выклікалі гаспадарчы крызіс. Тэрыторыя Беларусі на працягу больш за шэсць гадоў была арэнай баявых дзеянняў. Да таго ж яна аказалася падзеленай па ўмовах Рыжскага міру. Пасяўныя плошчы зменшыліся больш як на трэць. Аб'ём прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў менш за 50% ад даваеннага. Тысячы сялян сутыкнуліся з недахопам прадуктаў. Прамысловая вытворчасць у 1920 г. у параўнанні з даваенным скарацілася ў 7 разоў. Зімой 1920-1921 гг. у Менску, напрыклад, не было паліва і не працаваў транспарт.

Становішча ўскладнялася тым, што працягвалася палітыка "ваеннага камунізму". Сяляне ва ўмовах пераходу ад вайны да мірнага жыцця выказвалі ўсё большую незадаволенасць харчразвёрсткай. Яны не разумелі, чаму зараз, калі вайна скончылася, трэба аддаваць амаль усе свае прадукты на патрэбы Чырвонай Арміі.

…Харчразвёрстка ў вёсцы замінала ўздыму прадукцыйных сіл і з'явілася асноўнай прычынай глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу….

Увядзенне нэпа дабратворна адбілася на стане сельскай гаспадаркі. Да 1927 г. яна была поўнасцю адноўлена. Нэп паўплываў на развіццё некаторых галін прамысловасці. Пачалі працаваць мінскія чыгуналіцейны і машынабудаўнічы заводы. Аднаўляліся і будаваліся новыя прадпрыемствы: запалкавая фабрыка "Бярэзіна" ў Барысаве, абутковая і кандытарская фабрыкі ў Гомелі, лесапільныя і гарбарныя заводы. Да сярэдзіны 1920-х гг. на тэрыторыі Беларусі было пабудавана звыш 20 электрастанцый. Яны з'яўляліся крыніцай энергіі для прамысловых прадпрыемстваў. У 1927 г. дробная прамысловасць перасягнула даваенны ўзровень развіцця.

**II. З дэкрэта «Аб замене харчовай і сыравіннай развёрсткі натуральным падаткам»** *(21 сакавіка 1921 г.)*

1. Для забеспячэння правільнага і спакойнага вядзення гаспадаркі на аснове больш свабоднага распараджэння земляробам прадуктамі сваёй працы і сваімі гаспадарчымі сродкамі, для ўмацавання сялянскай гаспадаркі і павелічэння яе прадукцыйнасці… развёрстка як спосаб дзяржаўных нарыхтовак харчавання, сыравіны і фуражу замяняецца натуральным падаткам.

2. Гэты падатак павінен быць меншы за абкладанне, якое накладвалася да гэтага часу шляхам развёрсткі …

8. Усе запасы харчавання… якія застаюцца ў земляробаў пасля выканання імі падатку, знаходзяцца ў поўным іх распараджэнні і могуць выкарыстоўвацца імі для паляпшэння і ўмацавання сваёй гаспадаркі, для павышэння ўласнага спажывання і для абмену на прадукты фабрычна-завадской і саматужнай прамысловасці і сельскагаспадарчай вытворчасці.

**III. Асноўныя мерапрыемствы палітыкі "ваеннага камунізму" і новай эканамічнай палітыкі**

| **Палітыка «ваеннага камунізму»** | **Новая эканамічная палітыка** |
|---|---|
| Харчразвёрстка | Увядзенне харчовага падатку |
| Забарона свабоды гандлю | Дазвол свабоды гандлю |
| Натуральны абмен прадуктамі | Выкарыстанне таварна-грашовых адносін і ўвядзенне савецкага чырвонца |
| Нацыяналізацыя прамысловасці, забарона прыватных прадпрыемстваў | Дазвол дробнай прыватнай уласнасці, дапушчэнне замежнага капіталу, дазвол найму працоўнай сілы і арэнды зямлі |
| Увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці | Свабодны выбар форм землекарыстання, развіццё сельскагаспадарчай кааперацыі |
| Ураўняльны прынцып аплаты працы | Розныя формы аплаты працы |